*УДК 930.85:7.01:7.038*

**А. В. Цімашэнка**
***Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт***

# ЭСТЭТЫКА ПОСТМАДЭРНІЗМУ, АВАНГАРДУ І МАДЭРНІЗМУ ЯК КУЛЬТУРНЫЯ ФЕНОМЕНЫ

*У дадзеным артыкуле размяжоўваюцца паняцці такіх эстэтычных сістэм, як постмадэрнізм, мадэрнізм і авангард. Даецца характарыстыка парадыгмальных рысаў мадэрнізму і авангарду. Разглядаюцца асноўныя заканамернасцістанаўлення постмадэрністцкай канцэпцыі, асэнсоўваецца механізм іроніі і прычыны яго з'яўлення ў чалавечым мысленні і культуры постсучаснасці.*

Культура постмадэрнізму вырасла з напрамкаў мадэрнізму і авангарду і ўвабрала ў сябе асаблівасці папярэдніх мастацка- эстэтычных кірункаў, не адмаўляючы іх, а інтэрпрэтуючы і мадыфікуючы. Як слушна заўважае Э. Усоўская, «постмадэрнізм з'яўляецца і антыподам мадэрнізму, і яго пераемнікам, а таксама паслядоўнікам цэлага спектра іншых культурна-гістарычных эпох, рухаў, напрамкаў, думак» [1, с. 5]. Вытокі з'яўлення філасофіі постмадэрнізму можна ўбачыць у тэорыі псіхааналізу З. Фрэйда, філасофіі экзістэнцыялізму і ніцшэанстве, але станаўленне постмадэрнісцкай культуры адбылося ў рамках постструктуралізму і дэканструкцыі.

Першым азначэнне постмадэрнізму ў якасці разумення стану постсучаснасці прымяніў французскі філосаф-постструктураліст Жан- Франсуа Ліятар у працы «Стан постмадэрну», дзе вучоны паставіў пытанне аб сучасным статусе ведаў у інфармацыйных грамадствах, канфлікце дыскурсаў навукі і метафізічнага аповеду, крызісу вялікіх наратываў [Гл. 2]. Як слушна заўважае сучасная польская даследчыца А. Бужыньска, «плыні з прыстаўкай –пост-‖ з'яўляюцца ў хвіліну, калі адчуваецца крызіс дадзенай традыцыі або вычарпанасці яе ранейшых магчымасцяў. Аднак яны не азначаюць фактычнага канца гэтых традыцый (фармацый, парадыгмаў і г. д.), а суіснуюць з імі ў якасці крытычнага варыянта» [3, с. 351]. Прыстаўка «пост-» паходзіць з лацінскай і старажытнагрэцкай мовы і мае значэнне як «пасля, у выніку», так і «падчас, у, пры», таму канатацыя ўсіх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тэрмінаў з дадзеным прэфіксам рэалізуецца ў двух напрамках: часавым (быць пасля чаго-небудзь) і крытычным (пэўным пераглядзе папярэдняй сістэмы). «Быць ―пост-‖ значыць як ―пасля‖, так і ―пра‖» [3, с. 351], – заключае літаратуразнаўца А. Бужыньска.

Асноўныя канцэпцыі постмадэрнісцкай філасофіі базуюцца на крытычным пераглядзе заходнееўрапейскай культуры. У сваёй працы
«Паўстанне мас», якая мела грандыёзны ўплыў на развіццё тэорыі постмадэрну, Хасэ Артэга-і-Гасэт разважае аб наступствах тэхнічнага прагрэсу. Дзякуючы НТП навука перайшла ў антыэлітарны стан, веды набылі вузкаспецыялізаваны характар, а мастацтва стала даступным шырокаму сацыяльнаму колу, у выніку чаго з‘яўляецца чалавек масы,
«дзікун, Naturmensch» [4, с. 108], які не разумее і не хоча разумець прычын і вынікаў тых ці іншых працэсаў і з‘яў, а існуе ва ўмовах цывілізацыі як у нечым натуральным, тым, што было заўсёды. Ён не разбіраецца ні ў навуцы, ні ў культуры, але прагна і бяздумна праглынае плён дзейнасці папярэдніх пакаленняў грамадскай эліты і сучаснай яму інтэлектуальнай меншасці. Трагедыю іспанскі філосаф бачыць у тым, што з кожным годам чалавек масы прэваліруе ў грамадстве, што ў выніку можа прывесці да краху цывілізацыі.

Філасофія постмадэрнізму ў гэтым выпадку – здаровая рэакцыя на «амасаўленне» культуры. Х. Артэга-і-Гасэт сцвярджае, што іронія прысутнічае ў чалавечым мысленні заўсёды: «Любое паняцце або ўяўленне, будзь яно самым распаўсюджаным ці ж, наадварот, самым спецыяльным, пабудавана на іранічных адносінах да самога сябе» [4, с. 159]. Гэта абумоўлена неадпаведнасцю паняццяў аб чым-небудзь у нашым уяўленні і рэчаіснасці. Рацыяналістычнаму мысленню зручна ўсведамляць і тлумачыць рэальнасць схемамі, але такое асэнсаванне прыводзіць да таго, што «паняцце гаворыць нам адно, а на самой справе прадугледжвае нешта іншае, і ў гэтай дваістасці якраз і заключаецца іронія» [4, с. 159], – працягвае філосаф.

Іронія і гульня – асноўныя прынцыпы постмадэрнісцкай творчасці, якая прадугледжвае шматузроўневае разуменне сэнсаў, змешванне высокага і нізкага, масавага і элітарнага, у выніку чаго ствараецца культура для ўсіх. Але ў залежнасці ад адукаванасці і шырыні кругагляду рэцыпіенты ўсведамляюць

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

розную глыбіню сэнсаў, адсылак і інтэртэкстаў. У адрозненне ад культуры мадэрнізму і авангарду, якая пазіцыянавала сябе толькі як элітарная, мастацтва постмадэрнізму прымае пункт гледжання кожнага. Літаратуразнаўца Э. Усоўская прыводзіць у якасці прыкладу тэорыю Я. Персікава, згодна з якой мадэрнізм асацыюецца з асобай, што знаходзіцца пад уздзеяннем алкаголю, а таму актыўна і нават нахабна навязвае сябе і сваіх носьбітаў сусвету – «патрабуе павагі», а «псіхадэлічная (трэба меркаваць, постмадэрнісцкая) культура на змяненне сусвету не прэтэндуе – яна ўспрымае і адчувае яго. Асоба губляе абрысы цэласнасці, ідэнтычнасці сябе і як бы гэтым ганарыцца, паколькі можа быць адразу ўсім або выступаць ад імя ўсіх (размаўляць на розных ідэалагічных мовах, мяняць пункты гледжання, быць кімсьці альбо чымсьці)» [1, с. 48].

Трэба заўважыць, што расійскі культуролаг і філосаф В. Руднеў строга размяжоўвае паняцці мадэрнізму і авангарду. «У адрозненне ад мадэрнісцкага мастацтва, якое арыентуецца на наватарства ў галіне формы і зместу (сінтаксіса і семантыкі <…>), авангарднае мастацтва перш за ўсё будуе сістэмы наватарскіх каштоўнасцяў у галіне прагматыкі. Авангардыст не можа, падобна мадэрністу, замкнуцца ў кабінеце і пісаць у стол; самы сэнс яго эстэтычнай пазіцыі – у актыўным і агрэсіўным уздзеянні на публіку. Выраблять шок, скандал, эпатаж – без гэтага авангарднае мастацтва немагчымае» [5, с. 12]. На думку даследчыка, мадэрнізм больш пасіўны, мадэрністы – «шызоіды-аўтысты, замкнѐныя ў сваім эстэтычным свеце» [5, с. 14], а авангардысты – аўтарытарныя і агрэсіўныя. Але і мадэрнізм, і авангард аб‘ядноўвае тое, што абодва кірункі намагаюцца стварыць нешта прынцыпова новае, у адрозненне ад постмадэрнізму, сэнс якога заключаецца ў пераглядзе, перастварэнні і абыгрыванні старых, ужо існуючых, творчых здабыткаў.

Нягледзячы на тое, што літаратура постмадэрнізму арыентавана на назапашаны стагоддзямі сусветны вопыт, эпоха постмадэрну спарадзіла абмежаванага, неразумнага масавага чытача і гледача, які не бачыць і не ўспрымае інтэртэксты і адсылкі да прадуктаў культуры папярэдніх эпох. Мастацкія творы робяцца ўсѐ больш спрошчанымі і

накіраванымі на продаж, зусім губляючы звышсэнс і якую-небудзь эстэтычную каштоўнасць. Асабліва гэта тычыцца медыясферы (інтэрнэт-рэсурсы, прыкладам, youtube і г. д.), у якой рознага кшталту адсылкі і падтэксты скіраваны да твораў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сучаснікаў і калег па культурніцкай прасторы. Філосаф і сацыёлаг І. Габозаў называе постмадэрнізм «эпохай медыякратаў», маючы на ўвазе «татальнае панаванне пасрэдных людзей» [6, с. 41]. У бясконцасці адсылак і спрашчэнняў губляецца сэнс постмадэрнісцкай гульні і іроніі, і нават нешараговы, падрыхтаваны рэцыпіент больш не бачыць у прадукце творчасці першапачаткова закладзенай шматслойнасці. Гэта тычыцца не ўсіх постмадэрнісцкіх твораў, а з'яўляецца хутчэй пабочным эфектам масавай культуры спажывання і камерцыі. У процівагу гэтаму ў эпоху постмадэрну працягваюць існаваць прамадэрнісцкія творы, для якіх характэрна індывідуалізаванасць, суб'ектывізм і пэўная элітарнасць. Але ў адрозненне ад аналагічных твораў эпохі мадэрну, яны не адмаўляюць здабыткі папярэдніх эпох, а змяшчаюць у сабе інтэртэкст і адсылкі да іх. Такія творы таксама з'яўляюцца па сутнасці сваёй постмадэрнісцкімі, але з рысамі мадэрнісцкай і авангарднай мастацкіх сістэм.

Такім чынам, постмадэрнізм, што ўзнік на аснове здабыткаў авангарду і мадэрнізму, выразна адрозніваецца ад згаданых мастацка- эстэтычных кірункаў як сваім пафасам, сістэмай каштоўнасных каардынат, спосабамі дыялогу з рэцыпіентам, так і схільнасцю да выкарыстання адмысловых мастацкіх прыёмаў (інтэртэкстуальнасцю, гульнёй, эклектычнасцю, фрагментарнасцю і інш.). У сучаснай культурнай прасторы неабходна канстатаваць арганічнае суіснаванне і ўзаімапранікненне мастацкіх сістэм авангарду і постмадэрнізму, якое выяўляецца не толькі ў маштабах творчасці аднаго аўтара, але і ў межах аднаго тэксту.

## Спіс літаратуры

1 Усовская, Э.А. Постмодернизм / Э. А. Усовская. – Мінск: ТетраСистемс, 2006. – 256 с.

2 Лиотар, Ж.-Ф. Состояние постмодерна / Ж.-Ф. Лиотар; пер. с фр. Н. А. Шматко. – М.: Институт экспериментальной социологии; Спб.: Алетейя, 1998. – 160 с.

3 Бужыньска, А. Постструктуралізм. Постструктуралізм і іншыя «пост-» / А. Бужыньска // Тэорыі літаратуры XX стагоддзя / Анна Бужыньска, Міхал Павел Маркоўскі; прадм. Ганна Бутырчык; навук. рэд. Лявон Баршчэўскі. – Мінск: Медысонт, 2017. – 628 с.

4 Ортега-и-Гассет, Х. «Дегуманизация искусства» и другие работы. Эссе о литературе и искусстве. Сборник / Х. Ортега-и-Гассет; пер. с исп.; под ред. Н. Матяш. – М.: Радуга. Антология литературно-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

эстетической мысли, 1991. – 639 с.
5 Руднев, В.П. Словарь культуры XX века / В. П. Руднев. – М.: Аграф, 1999. – 384 с.
6 Гобозов, И.А. Постмодернизм – эпоха медиократов / И. А. Гобозов // Вопросы философии. – 2015. – № 12. – С. 41 – 53.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ